УДК 316.74(476+438)

# Беларуска-польскае культурнае памежжа: падыходы да тэарэтычнага асэнсавання праблемы

***Малая Н. У., Снапкоўскі С. У.***
*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, Мінск*

*Артыкул прысвечаны вывучэнню феномена беларуска-польскага культурнага памежжа. Аўтар паставіў мэту прааналізаваць разнастайныя падыходы шырокага кола польскіх і беларускіх навукоўцаў да тэарэтычнага асэнсавання праблемы з пункту гледжання гістарычнай навукі і культуралогіі, што адлюстраваны ў літаратуры апошніх дзесяцігоддзяў. У дадзенай працы разглядаюцца асноўныя ўмовы і фактары фарміравання і наступнага існавання беларуска-польскага культурнага памежжа пераважна на працягу XIX–XX стагодзяў.*

*Праблема памежнага статусу беларускай культуры даўно прыцягвала ўвагу айчынных і замежных навукоўцаў пры аналізе гістарычных, культурных, этнічных, рэлігійных, адукацыйных і іншых грамадскіх з'яў і працэсаў. У беларускай навуковай літаратуры ўжо сфарміравалася пэўная даследчая традыцыя ў даследаванні гэтага культурна-гістарычнага феномена.*

*Вывучэнне спецыфікі культуры пагранічча спрыяе больш дасканаламу аналізу гэтых працэсаў як унутры нашай краіны, так і на яе памежжы. У сучасным глабалізаваным свеце досвед разгляду рэгіянальных культур, іх узаемадзеяння і суіснавання адкрывае шлях да высвятлення бягучых этнарэлігійных супярэчнасцяў, праблем мультыкультуралізму, а таксама пошуку іх вырашэння.*

***Ключавыя словы:*** *культурнае памежжа, беларуска-польскія дачыненні, бікультурнасць.*

*(Искусство и культура. – 2018. – № 2 (30). – С. 72–76)*

# Belarusian-Polish Cultural Frontier: Approaches to Theoretical Understanding of the Issue

***Malaya N. U., Snapkovsky S. U.***
*Belarusian State University, Minsk*

*The article dwells upon the study of the phenomenon of Belarusian-Polish cultural frontier. The author aims at analyzing different approaches of a wide range of Polish and Belarusian scholars to theoretical understanding of the issue from the point of view of historical science and cultural studies which is reflected in the literature of the last decades. Main conditions and factors of shaping and further existence of Belarusian-Polish cultural frontier mainly during the XIX–XX centuries are considered in the article.*

*The issue of the borderline status of Belarusian culture has long attracted domestic and foreign researchers' attention while studying historical, cultural, ethnic, religious, educational and other social phenomena and processes. A certain research tradition in studying this cultural and historic phenomenon has already shaped in Belarusian scientific literature.*

*The study of the culture specificity of the borderland facilitates a more scrupulous analysis of these processes both inside our country and on its borders. In the contemporary globalized world the study of regional cultures, their interaction and coexistence opens the way to revealing current ethnic and religious contradictions, multiculturalism issues as well as search for their solution.*

***Key words:*** *cultural borderlands, Belarusian-Polish relations, bi-culturalism.*

*(Art and Cultur. – 2018. – № 2 (30). – P. 72–76)*

Праблема памежнага статусу беларускай культуры даўно прыцягвала ўвагу айчынных і замежных даследчыкаў пры вывучэнні гістарычных, культурных, этнічных, рэлігійных, адукацыйных і іншых грамадскіх з'яў і працэсаў. У беларускай навуковай літаратуры ўжо сфарміравалася пэўная даследчая традыцыя ў вывучэнні гэтага культурна-гістарычнага феномена [1, 2, 5, 9, 10, 11]. Дадзены артыкул прысвечаны разгляду праблематыкі беларуска-польскага культурнага памежжа з пункту гледжання гістарычнай навукі і культуралогіі.

У працы разглядаюцца асноўныя ўмовы і фактары фарміравання і наступнага існавання беларуска-польскага культурнага памежжа пераважна на працягу XIX–XX стагоддзяў.

Мэта артыкула – прааналізаваць разнастайныя падыходы польскіх і беларускіх навукоўцаў да тэарэтычнага асэнсавання праблемы, што адлюстраваны ў літаратуры апошніх дзесяцігоддзяў.

*Адрас для карэспандэнцыі: e-mail: mnatalochka09@gmail.com – Н. У. Малая*

Репозиторий БГУ

**Культурныя і духоўныя плыні на беларускім скрыжаванні.** Важна адзначыць, што ў працэсе свайго гістарычнага развіцця беларускі этнас аказаўся падзелены межамі: канфесіянальнымі, моўнымі, культурнымі, дзяржаўнымі, палітычнымі, што вяло да фарміравання сярод беларусаў розных ідэнтычнасцей. Перад беларускай культурай заўсёды вельмі востра стаялі праблемы ўзаемаадносін з іншанацыянальнымі, іншамоўнымі культурамі. Асаблівасці гістарычнага развіцця беларускага народа абумовілі адкрытасць яго культуры для замежных уплываў, глыбокую нацыянальную, этнакультурную талерантнасць. Узаемаадносіны беларусаў з іншымі народамі вагаліся ад узаемадзеяння і канструктыўных кантактаў да сутыкнення і ўзаемнага аднаўлення. На беларускім скрыжаванні сустракаліся, узаемадзейнічалі, узбагачаліся і пераасэнсоўваліся на мясцовай аснове многія, часта супрацьлеглыя культурныя і духоўныя плыні. У выніку распаўсюджвання іншанацыянальных уплываў тут паўсталі цэлыя культурныя субстраты і анклавы. Гэтыя культурна-духоўныя пласты немагчыма аддзяліць ад культуры Беларусі, якая мае такое ж права залічыць іх у сваю культурную спадчыну, як гэта рабілі і робяць у адносінах да многіх яе падзей і персаналій польская і руская культуры.

Многія ўраджэнцы Беларусі сталі выбітнымі дзеячамі асветы, культуры, навукі, працуючы за межамі Радзімы, пакінулі прыкметны след у культуры іншых дзяржаў і народаў, зрабілі важкі ўнёсак у сусветную культурную скарбніцу. У той жа час гісторыя культуры, асветы і педагагічнай думкі Беларусі ведае шмат замежнікаў, якія плённа развівалі яе культуру і навуку, неслі асвету яе народу і з дапамогай гэтага заслужылі яго падзяку, набылі вядомасць. Перапляценне культур рэгіёну Цэнтральнай і Усходняй Еўропы прывяло да таго, што многіх адных і тых жа дзеячаў кожны народ гэтага рэгіёну лічыць сваімі. У айчыннай гуманітарыстыцы роля і значэнне культурнага памежжа, культурных уплываў і так званых “хадакоў праз граніцы” (Grenzgaenger) пакуль яшчэ не асэнсаваны ў належнай меры, нягледзячы на тое, што ўся гісторыя культуры Беларусі ўяўляе сабой дыялектычнае адзінства разнастайных унутраных і знешніх фактараў.

У 1993 г., выступаючы на міжнароднай навуковай канферэнцыі “Рым–IV”, прысвечанай нацыянальным і рэгіянальным культурам (культурнаму памежжу) Беларусі, Літвы, Польшчы і Украіны, акадэмік Радзім Гарэцкі акцэнтаваў увагу на праблеме прыроднага і культурнага памежжа. Вучоны адзначыў: “Сярэдзінны мерыдыян Еўрапейскага кантыненту праходзіць праз Летуву, Беларусь, Украіну, сярэдзінная паралель – праз Польшчу, Беларусь, Расію. Перакрыжаванне гэтых мерыдыянаў і паралеляў знаходзіцца каля р. Бярэзіна, на паўднёвы ўсход ад Ігумена (цяпер Чэрвень). Тут – геаграфічны цэнтр кантынентальнай Еўропы. Такое геаграфічнае становішча гэтых краінаў і асабліва Беларусі заўсёды выклікала наймацнейшыя апетыты ў іньшых дзяржаваў. Таму межы краінаў тут мяняліся як у калейдаскопе, а разам з імі мяняліся суадносіны культураў, моваў, канфесіяў” [1, с. 4–5].

**Асаблівасці беларускага культурнага памежжа.** Сярод мноства розных межаў, якія падзяляюць грамадскія супольнасці, дзяржаўныя межы з’яўляюцца максімальна выразнымі, але, як ні дзіўна, надзвычай зменлівымі і нават недаўгавечнымі. Даволі часта гэтыя межы з’яўляюцца наступствам разнастайных палітычных падзей, вынікам палітычнай волі кіруючых элітаў ці персаналіяў і шматлікіх міжнародных дамоўленасцяў. Між іншым, цывілізацыйныя, эканамічныя, этнічныя, рэлігійныя межы з’яўляюцца больш устойлівымі, але пры гэтым вельмі празрыстымі і не заўсёды выразнымі. Беларуская даследчыца Л. М. Сямёнава лічыць, што межы часта становяцца не столькі фіксацыяй працягласці грамадска-палітычных арганізмаў, сімваламі іх размежавання паміж сабой, колькі “шрамамі гісторыі” [2, с. 10]. Яна прааналізавала генэзіс праблемы культурнага памежжа, адзначыўшы, што супольнасці першабытных людзей ужо мелі ўяўленне пра сваю тэрыторыю, якую сёння прынята называць сацыяльна-экалагічнай нішай. Пасля ў выніку цеснага ўзаемадзеяння плямёнаў у рамках пэўных прыродных зонаў вызначаліся гнуткія і размытыя этнічныя межы, межы эканамічных арэалаў. Такім чынам фарміраваліся контуры цывілізацый, якія французскі гісторык Ф. Бродэль назваў “свет-экономікамі”. Беларусь, паводле Бродэля, трапляла ці на перыферыю еўрапейскага свет-эканомікі, ці ў памежжа паміж еўрапейскай і расійскай свет-эканомікамі, што па сутнасці было адным і тым жа [2, с.11–12].

Пераасэнсаванне працэсаў трансфармацыі гістарычных межаў прыводзіць даследчыкаў да шэрагу высноў. Па-першае, усходняе становішча беларускіх зямель (у складзе Рэчы Паспалітай) з непазбежнасцю замацоўвала яе перыферыйнае месца ў рамках еўрапейскай сістэмы, як гэта пасля распаду СССР здарылася з краінамі Цэнтральнай і Паўднёва-Усходняй Еўропы. Па-другое, заходняе

Рэпазіторый БДУ

становішча Беларусі неаднаразова (у складзе Расійскай імперыі і Савецкага Саюза) адкрывала магчымасці для развіцця і росту. Больш за тое, заходняе становішча падмацоўваецца ўсім ходам сумеснай гісторыі, агульнарускай духоўнасці, рускага адзінства. Даследчыца бачыць перадумову паспяховага развіцця ў апоры на рацыянальныя эканамічныя падставы і праверaныя гісторыяй суб'ектыўныя духоўныя перавагі і ідэйна-палітычныя арыенціры, паколькі зыход ад роднай цывілізацыйнай спадчыны небяспечны многімі стратамі і рызыкамі [2, с. 13–14].

**Накірункі памежнай культурнай праблематыкі.** Праблемай беларуска-польскага культурнага памежжа займаецца шэраг беларускіх і польскіх даследчыкаў – культуролагаў, гісторыкаў, філосафаў, этнолагаў, педагогаў, філалагаў, сацыёлагаў і інш. На сучасным этапе глабалізацыі праблема беларуска-польскага культурнага памежжа з'яўляецца важнай і актуальнай для развіцця гуманітарных навук (перш за ўсё культуралогіі) як Польшчы, так і Беларусі. Аўтарытэтны беларускі даследчык пытанняў мяжы і памежжа М. Н. Бяспамятных у сваёй манаграфіі "Границы и пограничья: подходы, понятия, перспективы" прааналізаваў паняцце мяжы як перадумовы даследавання памежжа. Памежная праблематыка разглядаецца вучоным у рамках чатырох накірункаў: "даследаванні меж", сацыялогія памежжа, культурная антрапалогія і культуралогія. М. Н. Бяспамятных выяўлена спецыфіка падыходаў да праблемы памежжа і праведзены сістэмны аналіз паняційнага апарату, якім карыстаецца кожны з накірункаў. Аўтарам усебакова прааналізаваны вынікі даследаванняў памежных працэсаў у сумежных з Беларуссю арэалах Польшчы і Літвы [3, с. 2].

Гістарычныя і сучасныя аспекты беларуска-польскага памежжа актыўна даследваюць польскія аўтары. У сваёй працы "Пагранічча як тэрыторыя шанцу і небяспекі – погляд гісторыка XX стагоддзя" прафесар Ян Левандоўскі піша, што тэрыторыя беларуска-польскага памежжа фарміравалася на працягу многіх стагоддзяў. Аднак яго сённяшняе аблічча вызначылі перш за ўсё падзеі XX ст. У сучасных умовах, калі паўсталі новыя нацыянальныя дзяржаўныя ўтварэнні (маюцца на ўвазе Польская Рэспубліка, якая стала на шлях сістэмнай трансфармацыі, і Рэспубліка Беларусь, якая, ідзе шляхам незалежнасці), гэтае памежжа па-ранейшаму з'яўляецца памежжам шанцу і небяспекі [4, с. 123]. На думку Я. Левандоўскага, сучасны даследчык-гуманітарый павінен вызначыць умовы першаснага выкарыстання такога шанцу: найперш, непарушальнасць сённяшніх межаў і павага грамадзянскіх правоў усіх жыхароў памежжа ў дэмакратычных дзяржавах [3, с. 124].

Міраслава Папежыньска-Турэк сцвярджае, што ў нацыятворчым працэсе на этнічным сумежжы бачны дзве фазы. Фаза першая – гэта фарміраванне пачуцця моўнай сувязі беларусаў з палякамі. А другая – гэта час выспявання пачуцця больш шырокай, нацыянальнай, ідэалагічнай сувязі [5, с. 288]. Аўтарка абгрунтоўвае ўласны пункт гледжання адносна таго, што на польска-беларускім памежжы першая фаза фарміравання сучаснага беларускага народа ці фаза ўтварэння пачуцця моўнай сувязі прыпадае на міжваенны перыяд (1921–1939 гг.). Спецыфіка этнічнага беларуска-польскага памежжа вызначыла вялізную ролю рэлігіі і царквы, асабліва царквы праваслаўнай, у фарміраванні сучаснай беларускай нацыі, калі ўмацоўвалася пачуццё агульных моўных сувязяў. У міжваенны час, калі нацыятворчы працэс фарміравання беларусаў узмацніўся, праявіліся адмоўныя бакі гістарычнай спадчыны беларускага народа па абодва бакі дзяржаўнай савецка (беларуска)-польскай мяжы. Гэта – расійская скіраванасць праваслаўнай царквы, націск на яе з боку савецкіх і польскіх дзяржаўных уладаў і дзейнасць рымска-каталіцкага касцёла. Іх сукупнае ўздзеянне абмяжоўвала магчымасці праваслаўнай царквы ў выкананні нацыятворчай ролі. Падсумоўваючы свае думкі, М. Папежыньска-Турэк прыйшла да высновы, што праваслаўная рэлігія, несумненна, садзейнічала фарміраванню беларускай нацыянальнай супольнасці [5, с. 297].

Феномен памежжа прыцягвае ўвагу даследчыкаў у розных галінах ведаў і навук (геаграфіі, гісторыі, геапалітыцы, сацыялогіі, культуралогіі і іншых) на працягу двух апошніх стагоддзяў. Нярэдка ў якасці вызначальных характарыстык памежжа называюць геаграфічныя, палітычная ці сацыяльна-эканамічныя фактары, але найболей рэпрэзентатыўныя з іх – культурныя.

Пасля высвятлення поглядаў польскіх аўтараў на праблемы беларуска-польскага культурнага памежжа звернемся да беларускіх даследчыкаў. К. Ф. Лысак адзначае, што цікавасць да культуры памежжа выклікана не толькі тым, што на стыку культур становяцца найболей відавочнымі іх асаблівасці, але таксама больш інтэнсіўна з'яўляюцца новыя формы. Некаторыя даследчыкі скептычна ставяцца да павышанай увагі адносна культуры памежжа: на іх думку, найбольш прадуктыўным у рэчышчы тэарэтычнага асэнсавання асаблівасцей знешніх і ўнутраных

Рэпазіторый БДУ

працэсаў, якія ўплываюць на нацыянальную культуру, будзе большае засяроджанне на цэнтры, чым на перыферыі. У такім кантэксце культура памежжа ўспрымаецца як пераходная, няўстойлівая ці нават маргінальная: ужо не прыналежная да адной культуры, і якая яшчэ не паспела ўвайсці ў другую. У такім выпадку культура памежжа не з'яўляецца дастаткова рэпрэзентатыўнай пры вывучэнні культуры "метраполіі". Аднак далей К. Ф. Лысак падкрэслівае, што ўжо ў ходзе першых спроб спалучэння геаграфічных і антрапалагічных падыходаў у тлумачэнні асаблівасцей памежжа (Ф. Ратцэль) і асэнсавання гэтага феномену не як выніку сутыкнення дзяржаўных межаў, а як рэгіянальнай з'явы (Р. Блашар, М. Сор), памежная культура ў кантэксце даследаванняў усё больш набывала рысы самастойнага трывалага ўтварэння. І робіцца выснова аб тым, што памежжа нельга ўспрымаць як маргінальную прамежкавую з'яву: яна характарызуецца пэўнай устойлівасцю, спрыяе фарміраванню лакальнай ідэнтычнасці. Культура памежжа валодае ўласнай дынамікай развіцця, стварае своеасаблівыя ўзоры матэрыяльнай і духоўнай культуры, нараджае спецыфічную сімвалічную прастору [6, с. 93–94].

**Польскасць і беларускасць у культуралагічна-літаратурным дыскурсе.** Літаратаразнаўца і культуролаг Генадзь Праневіч даследаваў творчасць Адама Міцкевіча ў кантэксце беларуска-польскага культурнага ўзаемадзеяння. На яго думку, А. Міцкевіч быў першым, хто пачаў вялікую патрыятычную песню Беларусі ў новым часе. Сваім лакальным беларускім зместам, закаранёнасцю ў народнае паэтычнае мастацтва і традыцыі старабеларускай літаратуры, сваімі вобразамі-згадкамі старой Літвы творчасць вялікага паэта аказала вялікі ўплыў на станаўленне новай беларускай літаратуры і выпрацоўку беларускай нацыянальнай ідэі [7, с. 339–340].

Беларускі і адначасова польскі даследчык Сяргей Кавалёў прааналізаваў розныя аспекты развіцця беларускай драматургіі XX–XXI стст. у працах польскіх аўтараў. Актуальнасць гэтай праблемы ў Польшчы ў апошнія часы звязаная з прыкметным ростам цікавасці да беларускай драматургіі і тэатра, асабліва да сучаснага іх стану. На яго думку, "бясспрэчны з'яўляецца факт, што ў ніякай іншай замежнай краіне не друкуецца столькі матэрыялаў пра беларускую літаратуру і мастацтва, як ў Польшчы. Можна смела сцвярджаць, што без уліку польскіх публікацый сёння ўсур'ёз займацца вывучэннем беларускага тэатра і драматургіі немагчыма" [8, с. 147].

Вячаслаў Караткевіч раскрыў тыпалагічныя сыходжанні вобразнай сістэмы ў творчасці польскага драматурга Славаміра Мрожака і прадстаўнікоў беларускай драматургіі канца XX ст. Аўтар прыйшоў да высновы, што важнай асаблівасцю развіцця тэатральнага мастацтва XX стагоддзя ў Польшчы і Беларусі з'яўляецца нараджэнне драмы абсурду ў межах яе ўсходняй мадэлі. Падабенства грамадскага жыцця і культурнай сітуацыі ў абедзвюх краінах абумовіла зварот беларускіх драматургаў да вопыту вядомага і па сутнасці, вельмі польскага, нягледзячы на доўгую эміграцыю, мастака Славаміра Мрожака. Гэтае падабенства заўважаецца, найперш на ўзроўні фарміравання вобразнай сістэмы і стратэгіі яе прэзентацыі [8, с. 149].

Жанна Некрашэвіч-Кароткая прааналізавала праблему польскасці і беларускасці ў літаратуры XIX ст. і зрабіла спробу вызначэння стратэгіі ідэнтыфікацыі ў сучасным літаратуразнаўчым дыскурсе. Яна актуалізавала абраную тэму і звязала гэта з тым, што адпаведныя ідэнтыфікацыйныя стратэгіі ўзніклі ў рэчышчы польскага (дакладней, "пострэчыпаспалітаўскага") пісьменства, якое развівалася ў межах Расійскай імперыі. У той жа час пры ўсёй складанасці культурнай і палітычнай сітуацыі гэтыя стратэгіі паўплывалі ў далейшым на фарміраванне ўласна беларускага літаратурнага працэсу. На думку даследчыцы, уяўленне пра польскасць, ад якой так актыўна адштурхоўваўся амаль што ўвесь папярэдні культурны дыскурс гісторыі Беларусі, не ўяўляе ніякай небяспекі для беларускай нацыянальнай ідэі. Гэта папросту зусім іншая польскасць – польскасць, роўная шляхецкасці [9, с. 118]. Беларускія аднадворцы былі менавіта тым асяроддзем, у якім нараджаўся і беларускі пісьменнік, і беларускі чытач XIX ст. Яны лічылі сябе польскай шляхтай (nobilitas Polona), але яны добра ўсведамлялі сваю "ліцвінскую", альбо "беларускую", ці нават "крывічскую" (як у выпадку з Янам Чачотам) культурную адметнасць. Але прыналежнасць да шляхецкага саслоўя была рэальнай стратэгіі ідэнтыфікацыі альбо, паводле П'ера Бурдзьё, модусам пазіцыянавання для аўтараў з Беларусі – ад Адама Міцкевіча да Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча.

Абодва модусы пазіцыянавання – шляхецкасць і мужыцкасць – адыгралі важную ролю ў развіцці літаратуры на Беларусі. Аднак у межах гэтых модусаў асаблівую ролю ў спасціжэнні сваёй ідэнтычнасці адыгрывала гарачае патрыятычнае пачуццё і яго эксплікацыя ў найважнейшых, праграмных для аўтараў творах. Пачаткі двух нацыянальных эпасаў беларусаў,

Рэпазіторый ВДУ

створаных двума Міцкевічамі, непасрэдна карэліруюць паміж сабой у гэтым сэнсе: «Мой родны кут, як ты мне мілы». Творчасць як аднаго, так і другога (прычым другога – у постаці Якуба Коласа) вызначала гарызонты чаканняў беларускага чытача, але ў розныя эпохі. Пры гэтым асаблівую ролю ў спасціжэнні “свайго” адыгрываў песняр – вайдэлот Міцкевіча, лірнік у Сыракомлі, гусляр у Янкі Купалы і музыка ў Якуба Коласа. У гэтым вобразе выступае важны для сённяшняга чытача пасрэднік, які ажыццяўляе своеасаблівы герменеўтычны акт, аб’ядноўваючы мінуўшчыну свайго народа – у многіх адносінах польскую, з сучаснасцю – бясспрэчна, беларускай [9, с. 119].

**Бікультурнасць як рэальная з’ява культурнага жыцця Беларусі.** У навуковых працах Вячаслава Рагойшы ўзнята праблема бікультурнасці ў гісторыі беларуска-польскіх узаемаадносін. Даследчык вызначыў бікультурнасць як рэальную з’яву культурнага жыцця, прычыну і адначасова вынік цесных міжнацыянальных сувязяў. Ён выказвае ўпэўненасць, што гісторыя культуры Беларусі павінна ўлічыць і творчасць іншанацыянальных, у тым ліку, польскіх бікультурных творцаў беларускага паходжання. Толькі тады яна будзе адпавядаць самым высокім патрабаванням навуковай паўнаты і аб’ектыўнасці, а вывучэнне міжнацыянальных культурных узаемасувязяў набудзе сваю канчатковую завершанасць [10, с. 328].

**Заключэнне.** Такім чынам, памежная ідэнтычнасць абумоўлена ўстойлівасцю ўзаемных беларуска-польскіх культурных рэфлексій. Прыналежнасць беларусаў і палякаў у пэўныя гістарычныя перыяды да розных дзяржаўных утварэнняў стала вызначальным чыннікам культурнай рэфлексіі памежжа. Ахарактарызаваныя намі тэарэтычныя падыходы, распрацаваныя беларускімі і польскімі даследчыкамі, заснаваны на комплексе гістарычных, культуралагічных, адукацыйных, літаратуразнаўчых і іншых фактараў. Іх рознабаковы аналіз дапаможа забяспечыць глыбокае навуковае асэнсаванне праблемы беларуска-польскага культурнага памежжа.

Аналізуючы феномен памежнага статусу беларускай культуры, можна канстатаваць яе шматузроўневы памежны статус: беларусы ўзаемадзейнічаюць не толькі з жыхарамі суседніх дзяржаў, але і з прадстаўнікамі іншых рэлігій і народаў унутры сваёй краіны; жывуць побач не толькі з літоўцамі, латышамі, украінцамі, палякамі, рускімі ў памежных рэгіёнах, але і з беларусамі па той бок мяжы. Этнічная і сацыякультурныя працэсы ў пагранічных рэгіёнах прадстаўляюць асаблівы інтарэс. Пры гэтым вывучэнне спецыфікі культуры пагранічча спрыяе больш дасканаламу аналізу гэтых працэсаў як унутры нашай краіны, так і на яе памежжы. У сучасным глабалізаваным свеце досвед вывучэння рэгіянальных культур, іх узаемадзеяння і суіснавання адкрывае шлях да высвятлення бягучых этнарэлігійных супярэчнасцяў, праблем мультыкультуралізму, а таксама пошуку іх вырашэння.

**ЛІТАРАТУРА**


1. Гарэцкі, Р. Прыроднае і культурнае памежжа / Р. Гарэцкі // Беларусіка=Albaruthenika: Кн. 3: Нацыянальныя і рэгіянальныя культуры, іх узаемадзеянне / рэд. А. Мальдзіс [і інш.]. – Мінск: Навука і тэхніка, 1994. – С. 3–5.
2. Семенова, Л. Н. Беларусь в европейском пограничье / Л. Н. Семенова // Проблемы истории и культуры пограничья: гуманитарное знание и вызовы времени: материалы междунар. науч. конф., посвящ. 200-летию И. Е. Храповицкого, г. Верхнедвинск, 16 июня 2017 г. / Верхнедвинский историко-краеведческий музей; редкол.: В. А. Ганский (гл. ред.), М. Г. Бембель, Т. С. Дмитриева [и др.]. – Минск: Белнаучкнига, 2017. – С. 10–14.
3. Беспамятных, Н. Н. Границы и пограничья: подходы, понятия, перспективы / Н. Н. Беспамятных; под науч. ред. проф. М. А. Можейко. – Минск: РИВШ, 2012. – 206 с.
4. Левандоўскі, Я. Пагранічча як тэрыторыя шанцу і небяспекі – погляд гісторыка XX стагоддзя / Я. Левандоўскі // Беларусіка=Albaruthenika: Кн. 3: Нацыянальныя і рэгіянальныя культуры, іх узаемадзеянне/ рэд. А. Мальдзіс [і інш.]. – Мінск: Навука і тэхніка, – 1994. – С. 120–124.
5. Папежыньська-Турэк, М. Рэлігія і царква ў фарміраванні сучаснага беларускага народа на польска-беларускім этнічным сумежжы / М. Папежыньська-Турэк // Беларусіка=Albaruthenika: Кн. 3: Нацыянальныя і рэгіянальныя культуры, іх узаемадзеянне / рэд. А. Мальдзіс [і інш.]. – Мінск: Навука і тэхніка, 1994. – С. 286–297.
6. Лысак, К. Ф. Культурнае пагранічча: маргіналія ці ўнікальная форма / К. Ф. Лысак // Проблемы истории и культуры пограничья: гуманитарное знание и вызовы времени: материалы междунар. науч. конф., посвящ. 200-летию И. Е. Храповицкого, г. Верхнедвинск, 16 июня 2017 г. / Верхнедвинский историко-краеведческий музей; редкол.: В. А. Ганский (гл. ред.), М. Г. Бембель, Т. С. Дмитриева [и др.]. – Минск: Белнаучкнига, 2017. – С. 92–95.
7. Праневіч, Г. Адам Міцкевіч у кантэксце беларуска-польскага літаратурнага ўзаемадзеяння / Г. Праневіч // Беларусіка=Albaruthenika: Кн. 3: Нацыянальныя і рэгіянальныя культуры, іх узаемадзеянне / рэд. А. Мальдзіс [і інш.]. – Мінск: Навука і тэхніка, 1994. – С. 333–340.
8. Кавалёў, С. Беларуская драматургія XX–XXI стст. у польскіх даследаваннях / С. Кавалёў // Беларуска-польскія моўныя, літаратурныя, гістарычныя і культурныя сувязі: зб. арт. / пад рэд. І. Э. Багдановіч. – Мінск: Кнігазбор, 2014. – С. 139–149.
9. Некрашэвіч-Кароткая, Ж. «Польскасць» – «беларускасць» у літаратуры XIX ст.: стратэгіі ідэнтыфікацыі ў сучасным літаратуразнаўчым дыскурсе / Ж. Некрашэвіч-Кароткая // Беларуска-польскія моўныя, літаратурныя, гістарычныя і культурныя сувязі: зб. арт. / пад рэд. І. Э. Багдановіч. – Мінск: Кнігазбор, 2014. – С. 112–120.
10. Рагойша, В. Праблема бікультурнасці ў гісторыі беларуска-польскіх узаемаадносінах / В. Рагойша // Беларусіка=Albaruthenika: Кн. 3: Нацыянальныя і рэгіянальныя культуры, іх узаемадзеянне/ рэд. А. Мальдзіс [і інш.]. – Мінск: Навука і тэхніка, 1994. – С. 322–328.


*Паступіў у рэдакцыю 23.04.2018 г.*

Репозиторий ВГУ